Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

Исторический факультет

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНОГО ЗНАНИЯ

Материалы III Международной студенческой
научно-теоретической конференции

Минск, 18 апреля 2018 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Минск
РИВШ
2018

УДК 378.14:30(061.3)
ББК 74.58:60
А43

Р е к о м е н д о в а н о
советом исторического факультета
УО «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка»
(протокол № 8 от 29 марта 2018 г.)

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я :
кандидат исторических наук доцент *А. В. Касович* (отв. ред.);
кандидат исторических наук доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат педагогических наук доцент *А. А. Корзюк;*
кандидат исторических наук доцент *А. Ф. Великий*

Р е ц е н з е н т ы :
доктор исторических наук профессор *А. М. Лютый;*
доктор исторических наук профессор *И. В. Варивончик*

**Актуальные** проблемы социально-гуманитарного знания : материалы III Междунар. студ. науч.-теорет. конф., Минск, 18 апр. 2018 г. / редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]; Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Минск : РИВШ, 2018. – 246 с.
А43

ISBN 978-985-586-129-5.

В сборнике представлены материалы исследований молодых ученых высших учебных заведений Республики Беларусь и Российской Федерации, учащихся учреждений общего среднего образования, посвященные актуальным проблемам исторических, педагогических и социально-гуманитарных научных дисциплин.

Адресуется преподавателям, магистрантам и студентам вузов.

**УДК 378.14:30(061.3)**
**ББК 74.58:60**

**ISBN 978-985-586-129-5**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

базилиане, исповедовавшие греческий обряд. В православных храмах стали отправлять католическую литургию. И если поначалу прокатолическая политика новых властей закономерно вызывала у населения неприятие, то к моменту возвращения города в состав Московского государства (1654 г.) католицизм и уния в нём закрепились уже достаточно прочно [6, с. 79-80].

В классической польской историографии еще М. Бобржинским была изложена точка зрения, согласно которой воспитанник иезуитов Сигизмунд III Ваза едва ли не во всём подчинялся своим учителям даже оказавшись на престоле [2, с. 144-148]. В грандиозные планы по заполучению абсолютной власти и обращению соседей Речи Посполитой в католицизм уния западнорусских епископов с Римом вписывалась более чем удачно. Однако попытка расширения властных полномочий закончилась бунтом Зебжидовского, а союз церквей лишь углубил социальные противоречия. И всё же для короля объединение церквей оставалось делом принципиальной важности. О набожности правителя и его приближенных хорошо знали в римской курии [7, с. 185-186]. Его интересы совпадали с намерениями римского понтифика, рассчитывавшего на то, что уния в перспективе позволит преодолеть церковный раскол и воссоединит всех «схизматиков» с католической церковью.

В период правления Сигизмунда III, продлившегося до 1632 г., прежде отличавшееся относительной веротерпимостью многоэтничное государство Польши и Литвы пережило период усиленной католической реакции. Социальный конфликт, порождённый всесторонне поддержанной королём Речи Посполитой унией 1596 г., стал одной из причин упадка страны, выразившегося в середине XVII в. в глубоком внутреннем кризисе. В ходе восстания под предводительством Богдана Хмельницкого на территориях, подконтрольных казачеству, деятельность греко-католической церкви прекращалась [4, с. 195]. Церковный союз, поддержанный королевской властью, оказал дезинтегрирующее влияние на развитие общества Речи Посполитой.

*Литература*

1. Беднов, В.А. Православная церковь в Польше и Литве (по Volumina Legum) – Минск: «Лучи Софии», 2002. – 432 с.
2. Бобржинский, М. Очерк истории Польши. Том 2. – Санкт-Петербург.: Издание Л.Ф. Пантелеева, 1891. – 348 с.
3. Брестская уния и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI – начале XVII в. Часть I. Брестская уния 1596 г. Исторические причины события. Отв. ред. Б.Н. Флоря. – Москва: «Индрик», 1996. – 199 с.
4. Брестская уния и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI – начале XVII в. Часть II. Брестская уния 1596 г. Исторические последствия события. Отв. ред. Б.Н. Флоря – Москва: «Индрик», 1996. – 198 с.
5. Плохий, С.Н. Папство и Украина (Политика римской курии на украинских землях в XVI-XVII вв.) – Киев: Выща школа, 1989. – 224 с.
6. Смоленск на перекрестке цивилизаций. (Менталитет и повседневная жизнь смоленских жителей по материалам публицистических и литературных произведений XVII-XVIII вв.): коллективная монография. – Смоленск: издательство СмолГУ, 2014. – 142 с.
7. Уния в документах: сборник. Сост. В.А. Теплова, З.И. Зуева. – Минск: «Лучи Софии», 1997. – 520 с.

## РЭАРГАНІЗАЦЫЯ МЯСЦОВАЙ ЛЕСААХОЎНАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ Ў ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў КАНЦЫ 30-Х – ПАЧАТКУ 40-Х ГГ. XIX СТ.

*І.В. Пугач, аспірант, гістарычны факультэт, БДПУ, Мінск*
*навук. кір. – А.П. Жытко, докт. гіст. навук, праф., БДПУ*

Пасля далучэння Віцебшчыны да Расійскай імперыі, на яе землі прыйшла своеасаблівая сістэма кіравання ляснымі рэсурсамі. У 1775 г. паводле рэформы мясцовай адміністрацыі тут была ўтворана казённая палата, падзеленая на экспедыцыі. Адным з кірункаў дзейнасці палат быў нагляд за дзяржаўным лесам, які ажыццяўляўся шляхам уліку лясных угоддзяў і маніторынгу іх становішча, выдаткоўваннем грашовых сродкаў на ўтрыманне лясной гаспадаркі, разгляду пытанняў аб выдачы жалавання і змене ў штатных раскладах і г. д. [5, с. 51–52; 6]. Пасля выдання 19 чэрвеня 1826 г. указа аб новым уладкаванні лясной справы, обер-фарштмайстры былі перайменаваны ў губернскіх ляснічых і са сваімі канцылярыямі былі злучаны з казёнными палатамі, у якіх былі створаны лясныя аддзяленні [9].

Трэба адзначыць, што пэўны час асобнага цэнтральнага органа дзражаўнай улады па кіраванні дзяржаўнымі маёмасцямі, а значыць і казённымі лясамі, не існавала. Адпаведныя функцыі выконваў спачатку Лясны дэпартамент, а пазней – дэпартамент дзяржаўных маёмасцей Міністэрства фінансаў [7; 8]. Разам з тым, спецыфіка сацыяльна-эканамічнага развіцця Расійскай імперыі ў 1830-я гг. патрабавала стварэння такога ведамства. Указам ад 26 снежня 1837 г. было створана Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, якое пачало сваю дзейнасць з 1 студзеня 1838 г. У яго склад уваходзілі Савет міністра, Канцылярыя міністра, Вучоны камітэт і 3 дэпартаменты.

Дзяржаўны лес беларускіх губерняў, які апынуўся пад юрысдыкцыяй новага міністэрства, падлягаў нагляду Другога дэпартамента дзяржаўных маёмасцей. Утварэнне Міністэрства дзяржаўных маёмасцей прадугледжвала стварэнне ўласных мясцовых органаў, а значыць вяло да рэфармавання сістэмы мясцовай лесаахоўнай адміністрацыі. Да арганізацыі дзейнасці спецыяльных мясцовых органаў новага міністэрства справы, звязаныя з дзяржаўнымі маёмасцямі і дзяржаўнымі сялянамі, заставаліся ў юрысдыкцыі казённых палат [11].

30 красавіка 1838 г. было прынята рашэнне аб неабходнасці стварэння мясцовых органаў кіравання Міністэрства дзяржаўных маёмасцей – палат дзяржаўных маёмасцей. Першапачаткова палаты ствараліся ў Санкт-Пецярбургскай, Маскоўскай, Пскоўскай, Курскай і Тамбоўскай губернях [12]. На тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і ў Віцебскай губерні, сваю дзейнасць новыя мясцовыя органы пачалі амаль на два гады пазней [3, арк. 122]. У пераходны перыяд з мэтай аптымізацыі працэсу перадачы спраў ад казённай палаты да палаты дзяржаўных маёмасцей дзейнічала Віцебская падрыхтоўчая камісія, якая была ўтворана 3 ліпеня 1839 г. [3, арк. 18]. Сярод астатніх абавязкаў падрыхтоўчай камісіі варта вылучыць збор і праверку звестак аб лясных прасторах губерні. Так, згодна з данымі “Ведомости о землях состоящих под пашнями, лугами и лесами казённых имений и крестьян”, казённыя лясы складалі каля 8,5 % ад плошчы ўсіх лясоў губерні і крыху больш за 3,5 % ад усёй тэрыторыі губерні. Найбольшая колькасць казённых лясоў была сканцэнтравана ў Гарадокскім павеце – 38913 дзес.; найменей багатым на казённы лес быў Рэжыцкі павет – 1047 дзес. [1, с. 210; 4, арк. 51–64].

На працягу пераходнага перыяду, з улікам досведу ўвядзення новай мясцовай лесаахоўнай адміністрацыі ў іншых губернях Расійскай імперыі, удакладнялася і дзейнасць па ахове лясоў на Віцебшчыне.

У прыватнасці, праводзілася работа па ўдасканаленні вядзення справаводства і кантралявання стану дзяржаўных лясоў. Цыркулярным прадпісаннем ад 15 мая 1838 г. казённыя палаты і палаты дзяржаўных маёмасцей абавязваліся падаваць у дэпартамент дзяржаўных маёмасцей штомесячныя ведамасці аб усіх новых самавольных высечках і пажарах з ацэнкай знішчанага лесу [3, арк. 109]. Цыркулярным прадпісаннем ад 29 студзеня 1839 г. было адноўлена ўключэнне ў ведамасці, якія прадстаўляліся пры гадавых справаздачах, спраў аб вынішчэнні казённых лясоў “Учреждения об управлении государственными имуществами” [3, арк. 55]. Актуальнай праблемай з’яўлялася скарачэнне службовай перапіскі. Так, у выпадку нязгоды казённай палаты ці палаты дзяржаўных маёмасцей з рашэннем крымінальнай палаты ці калі пастанова не была зацверджана губернатарам роўна як і пры такіх абставінах, калі па агульным крымінальным парадку справа належала да вышэйшага разгляду, то яна прадстаўлялася ад начальніка губерні з яго меркаваннем Правячаму Сенату, дзе і атрымлівала канчатковае вырашэнне. Для дасягнення адзначанай мэты, было прадпісана, каб справы аб вынішчэнні лясоў, якія патрабавалі рэвізіі, траплялі ў Сенат без прамаруджвання і каб у дэпартамент даводзілі толькі пра тыя справы, у вядзенні якіх угледжаны былі важныя адступленні ад устаноўленага парадку [3, арк. 117 ад.].

Прадпрымаліся захады і да пакупнікаў казённага лесу з мэтай абавязковага выканання імі ўсіх устаноўленых на высечку лясоў правіл. Згодна з прадпісаннем ад 2 красавіка 1839 г., лясныя чыноўнікі, пры выдачы білетаў на высечку дзяржаўных лясоў, бралі з пакупнікаў падпіску аб выкананні ўсіх устаноўленых на гэты конт норм і правіл. Акрамя падрабязнага апісання ўзгаданых правіл, падпіскі ўтрымлівалі дапаўненне аб тым, што калі пакупнікі не здолеюць высекчы ўвесь аб’ём набытага лесу ва ўстаноўлены па білету тэрмін, то выкарыстанне нявысечанай драўніны забаранялася, а ўсе правапарушэнні праследаваліся ў адпаведнасці з заканадаўствам [3, арк. 69–69 ад.]. Акрамя таго, увага звярталася на папярэджанне правапарушэнняў з боку лясных чыноўнікаў, аб чым сведчыць цыркулярнае прадпісанне ад 13 кастрычніка 1839 г. Згодна з яго зместам, на кожнага начальніка, які не паведамляў у адпаведныя інстанцыі пра незаконныя ўчынкі сваіх падначаленых, не хадайнічаў аб звальненні супрацоўнікаў, няздольных да выканання пэўных службовых абавязкаў, накладалася адказнасць, якую павінен быў несці вінаваты падначалены [3, арк. 85].

28 снежня 1839 г. было прынята рашэнне аб адкрыцці з 1 сакавіка 1840 г. Віцебскай палаты дзяржаўных маёмасцей. Першапачаткова палата дзяржаўных маёмасцей складалася з гаспадарчага,ляснога і судовага аддзяленняў. Узначальваў лясное аддзяленне губернскі ляснічы, у дапамогу якому прызначаўся вучоны ляснічы. У абавязкі ляснога аддзялення ўваходзілі апісанне, межаванне і таксацыя дзяржаўных лясоў, абасабленне іх ад прыватнаўласніцкіх лясоў і лясоў іншых ведамстваў, складанне планаў правільнага лесаводства, штогадовых каштарысаў лясной гаспадаркі і расцэнак на продаж лесу, а таксама вядзенне справаздачнасці і рахункаводства. У кантэксце лесаахоўнай дзейнасці ў абавязак аддзяленням ставіліся падзел казённых лясоў на акругі, лясніцтвы, лясныя ўчасткі, дыстанцыі альбо аб’езды і абыходы, кантроль за ажыццяўленнем агляду цэласці лясоў, захаванне іх ад захопаў, папярэджанне самавольных сечак лясоў і кантроль за супрацьпажарнай бяспекай. У сваю чаргу аддзяленне падзялялася на распарадчы, следчы і бухгалтарскі сталы. Распарадчы стол вёў справы па апісанні, межаванні, ахове і карыстанні лясамі, вылучэнні лясных участкаў для манастыроў, сельскіх абшчын,

дзяржаўных сялян, водпуску лесу на будаўніцтва і рамонт, а таксама па ўліку асабістага складу. Следчы стол разбіраў справы, звязаныя з парушэннем ляснога заканадаўства ці спрэчнымі лясамі. Бухгалтарскі стол быў адказны за фінансавую справаздачнасць па лясной частцы. Кадравы склад аддзялення вызначаўся на падставе прыкладзеных да закона штатаў. Так, згодна са штатамі, у склад лясного аддзялення ў Віцебскай губерні ўваходзілі губернскі ляснічы, вучоны ляснічы, справавод, які адначасова выконваў абавязкі сталаначальніка, бухгалтар, землямер і два пісары вышэйшага і сярэдняга разраду. На падставе ўказа ад 8 студзеня 1840 г., Віцебскую палату дзяржаўных маёмасцей узначаліў надворны саветнік Патулаў, а на пасаду губернскага ляснічага быў прызначаны старэйшы ляснічы Віцебскай казённай палаты тытулярны саветнік Эльснер [3, арк. 85; 14; 15].

Адметнай рысай працэсу рэарганізацыі сістэмы мясцовай лесаахоўнай адміністрацыі ў канцы 1830-х гг. стала стварэнне корпуса ляснічых. Згодна з палажэннем ад 30 студзеня 1839 г. лясное ведамства Міністэрства дзяржаўных маёмасцей атрымлівала ваеннае ўладкаванне. Сам корпус ляснічых узначальваў міністр дзяржаўных маёмасцей, а ў яго склад уваходзілі ўсе чыны губернскага лясного кіравання і навучальных лясных устаноў, а таксама пастаянная лясная варта. Ён падзяляўся на тры часткі, адпаведна тром дэпартаментам дзяржаўных маёмасцей. Чыны губернскага і акруговага лясного кіравання, якія дзейнічалі ў Віцебскай губерні, былі падначалены другому дэпартаменту дзяржаўных маёмасцей. Агульнае кіраванне ўсімі чынамі корпуса, у інспектарскім сэнсе, было даручана інспектару корпуса ляснічых. Для павышэння эфектыўнасці нагляду за дзейнасцю чыноў лясного корпуса прызначаліся віцэ-інспектары. З мэтай арганізацыі ў губернях дзеяздольнай лясной гаспадаркі ў корпус былі прызначаны запасныя вучоныя ляснічыя і запасныя ляснічыя для выканання рознага характару даручэнняў. Трэба адзначыць, што першапачаткова корпус ствараўся як вопыт па меры заснавання ў губернях мясцовых органаў Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. Праз два гады з улікам усіх абставін, якія былі заўважаны ў працэсе дзейнасці ўстановы, неабходна было падаць палажэнне аб Корпусе ляснічых на канчатковы разгляд і зацвярджэнне. Акрамя таго, з мэтай удасканалення ахвы лясоў ва ўсіх губернях Расійскай імперыі, дзе існавала сістэма лясного кіравання, у адпаведнасці з палажэннем стваралася пастаянная лясная варта. Так, пры кожным лясным абыходзе павінна было быць устаноўлена асаблівае сямейства лясных вартаўнікоў. У склад лясной варты прымаліся сямейныя казённыя сяляне, якія абіраліся пераважна з адстаўных салдат і ніжэйшых ваенных чыноў. Ахоўваўся абыход пешым стралком з яго памочнікам і запаснымі стралкамі. Аб'езды замацоўваліся за коннымі аб'ездчыкамі. У лясніцтве галоўным з'яўляўся ляснічы, а ў лясным участку – падляснічы. Усёй лясной вартай губерні камандаваў губернскі ляснічы. Пастаянная лясная варта ахоўвала лясы ад самавольных высечак, пажараў, вяла улік высечанага лесу, збірала насенне, клеймавала дрэвы і г. д. Трэба адзначыць, што фарміраванне пастаяннай лясной варты ў Віцебскай губерні праводзілася згодна з адпаведнымі цыркулярнымі прадпісаннямі да палаты дзяржаўных маёмасцей ад 18 і 31 ліпеня 1839 г., 30 верасня 1842 г., 26 ліпеня 1843 г. [2, арк. 8–8 ад., 12–13 ад.; 10; 13].

Такім чынам, стварэнне палаты дзяржаўных маёмасцей і мясцовага аддзялення Корпуса ляснічых садзейнічала фарміраванню лесаахоўнай сістэмы ў Віцебскай губерні, што спрыяла эфектыўнаму развіццю лясной гаспадаркі рэгіёну.

*Літаратура*

1. История лесного дела Беларуси / В. П. Тарасенко [и др.]; Комитет лесного хозяйства Республики Беларусь, Институт леса Национальной академии наук Беларуси, Брянская государственная инженерно-технологическая академия. – 2 е изд. – Гомель : ИЛ, 2004. – 301 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей НГАБ). Ф. 27. Воп. 1. Спр. 44
3. НГАБ. Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 24.
4. НГАБ. Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 25.
5. Павлова, Дария Сергеевна. Становление и развитие местных финансовых учреждений в России в последней четверти XVIII – первой половине XIX веков (на материалах Верхневолжских губерний) : дис. на соискание учёной степени кандидата исторических наук : 07.00.02 / Павлова Дария Сергеевна. – Ярославль, 2011. – 243 с.
6. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – 1-е собр. – Т. 20. – Отд. 1. – № 14392. – С. 229–304.
7. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 25. – Отд. 1. – № 18534. – С. 255.
8. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 31. – Отд. 1. – № 24937. – С. 942.
9. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 1. – Отд. 1. – № 415. – С. 593–610.
10. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 7. – Отд. 1. – № 5869. – С. 943–956.
11. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 12. – Отд. 1. – № 10834. – С. 1039–1053.
12. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 13. – Отд. 1. – № 11189. – С. 405–654.
13. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 14. – Отд. 1. – № 11978. – С. 111–119.
14. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 14. – Отд. 1. – № 13035. – С. 989–1150.
15. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 14. – Отд. 2. – Штаты и табели. – 310.